ISSN 1818-8583
3/2011

# ВЕСЦІ БДПУ



## Серыя 2

ГІСТОРЫЯ
ФІЛАСОФІЯ
ПАЛІТАЛОГІЯ
САЦЫЯЛОГІЯ
ЭКАНОМІКА
КУЛЬТУРАЛОГІЯ

# Весці БДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 3(69) 2011**

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.**
**Эканоміка. Культуралогія**


## Змест


***Галоўны рэдактар***

**П.Д. Кухарчык**

***Рэдакцыйная калегія:***

В.В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)

Л.М. Давыдзенка

А.В. Данільчанка

А.П. Жытко

М.М. Забаўскі

І.В. Катляроў

П.В. Кікель

Г.А. Космач

А.М. Люты

У.А. Мельнік

А.І. Смолік

А.С. Цернавы

В.С. Цітоў

В.В. Шынкароў



***Паліталогія***

*Зенчанка В.А., Сіманоўскі С.І.* Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь ва ўмовах глабалізацыі......3

*Сіманоўскі І.С., Сіманоўскі С.І.* Станаўленне палітычнага прагназавання як навуковага кірунку......8

*Ястраб Д.С., Шынкароў І.А.* Прававыя аспекты нацыянальнай бяспекі......11

*Зенчанка С.В.* Знешняя міграцыйная палітыка Рэспублікі Беларусь: этапы станаўлення......15

*Зенчанка В.А., Сарокін А.А.* Масавы таталітарны палітычны рух: сутнасць, асаблівасці, тэндэнцыі развіцця......20

***Сацыялогія***

*Кабяк А.В.* Сацыяльныя інтарэсы жыхароў Беларусі ў сацыялагічным вымярэнні......25

*Галіч Л.П.* Сацыяльнае самаадчуванне насельніцтва Беларусі: аналіз рэгіянальных асаблівасцей......29

*Хамутоўская С.В.* Электаральныя паводзіны насельніцтва: аналіз у рамках сацыяльна-псіхалагічнага падыходу......34

*Шухатовіч В.Р.* Тытунекурэнне як сацыяльная з'ява......39

*Шушунова Т.М.* Вывучэнне біялагічнай арыентацыі самазахаваўчых паводзін студэнцкай моладзі з выкарыстаннем метаду няскончаных сказаў......43

*Андрас І. А.* Феномен прадпрымальнасці ў ацэнках беларускіх жанчын: шматмерны сацыялагічны аналіз......48

*Раманава С.П.* Асноўныя падыходы да даследавання інстытута адукацыі ў сучаснай амерыканскай і брытанскай сацыялогіі......53

***Эканоміка***

*Давыдзенка Л.М., Давыдзенка Т.Д.* Міжнародныя стандарты інфармацыйных сістэм кіравання прадпрыемствам......58

*Такарчук І.В.* Інавацыйны тып эканамічнага росту як ключавы фактар павышэння ўзроўню жыцця ў доўгатэрміновай перспектыве......63

*Васьковіч В.В.* Прыродныя рэсурсы як грамадскі набытак і метады іх вымярэння......67

УДК 32.001

*І.С. Сіманоўскі,*
*кандыдат палітычных навук, вядучы спецыяліст Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці, г. Мінск;*
*С.І. Сіманоўскі,*
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры паліталогіі БДУ*

# СТАНАЎЛЕННЕ ПАЛІТЫЧНАГА ПРАГНАЗАВАННЯ ЯК НАВУКОВАГА КІРУНКУ

Станаўленне навуковага прадбачання пачынаецца з таго часу, калі будучыняператварылася ў спецыяльны прадмет даследавання. Перадгісторыя палітычнага прагназавання звязана са станаўленнем футуралогіі. Упершыню тэрмін «футуралогія» (лац. *futurum* – будучыня) выкарыстаў у 1943 г. нямецкі навуковец О.К. Фляхтгейм. Адштурхоўваючыся ад прац О. Шпенглера, ён вылучыў шэраг праблем будучыні сусветнага развіцця. Пастулова футуралогія набыла міждысцыплінарную скіраванасць як у тэарэтычнай, так і ў прыкладной галінах даследавання.

У сучаснай літаратуры часта паняцці «прагназаванне» і «футуралогія» ўжываюцца як сінонімы. Найбольш стабільным з'яўляецца разуменне футуралогіі як варыянта доўгатэрміновага прагназавання. Так, Г. Кан і А. Вінер галоўную задачу футуралогіі бачылі ў распрацоўцы доўгатэрміновых прагнозаў, карысных для органаў, якія плануюць, палітыкаў і кіраўнікоў [1, с. 122]. Па меркаванні амерыканскага даследчыка Л. Блумфільда, футуралогія – гэта прагноз на доўгатэрміновую перспектыву [2, p. 278].

Пры гэтым найбольш важным і найбольш відавочным футуралагічным прыёмам, па меркаванні У. Феркіса, з'яўляецца экстрапаляцыя [3, с. 142]. Да футуралагічных прыёмаў адносілі таксама прагноз па аналогіі, прагноз экспертаў, метад «Дэльфі», крыжаваны матрычны метад, метад пабудовы дынамічных мадэлей, метад напісання сцэнарыяў [Там жа].

У савецкай літаратуры пад футуралогіяй разумелі канцэпцыі заходніх буржуазных філосафаў аб будучыні. Вылучаліся пазітывісцкія і гуманістычныя, песімістычныя і аптымістычныя, буржуазна-апалагетычныя, буржуазна-ліберальныя, дэмакратычна-асветніцкія і радыкальна-экстрэмісцкія футуралагічныя тэорыі.

Пачатак гісторыі навуковага прадбачання адносяць да з'яўлення ў другой палове XIX ст. жанру «разважанняў аб будучыні». Адрозніваюць раннюю і сучасную футуралогію. Станаўленне ранняй футуралогіі (другая палова XIX – першая палова XX ст. да Другой сусветнай вайны) праходзіла ў два этапы. Першы этап (другая палова XIX – пачатак XX ст. (да 1920-х гг.)) звязаны са з'яўленнем прац аб перспектыўных праблемах развіцця чалавецтва: горадабудаўніцтва, аховы здароўя, транспарту, энергетыкі; другі этап (1920 – першая палова 1940-х гг.) – са з'яўленнем «разважанняў аб будучыні» пад уплывам сенсацыйнага рашэння савецкага ўрада распрацоўваць планы развіцця народнай гаспадаркі.

У станаўленні сучаснай футуралогіі таксама можна вылучыць некалькі этапаў.

Першы этап – другая палова 1940 – 1950-я гг. (з прац Дж. Бернала і Н. Вінера аб навукова-тэхнічнай рэвалюцыі да адкрыцця пошукавага і нарматыўнага прагназавання). На дадзеным этапе даследаваліся перспектывы развіцця навукі і тэхнікі.

Другі этап – з пачатку да сярэдзіны 1960-х гг. – характарызуецца «прагнастычным бумам», калі ў заходніх краінах з'явілася шмат навуковых аналітычных цэнтраў па прагназаванні навукова-тэхнічных, сацыяльна-эканамічных і ваенна-палітычных змен. Тэхналагічнае прагназаванне ўжывалася да перспектыў развіцця чалавецтва на базе тэорый індустрыялізму і постіндустрыяльнага грамадства. Метады прагназавання засноўваліся на анкетаванні, мадэляванні і матэматыка-статыстычнай экстрапаляцыі. Па ініцыятыве прэзідэнта ЗША Дж. Кэнадзі быў створаны штаб саветнікаў па даследаванні будучыні. У 1965 г. пад старшынствам Д. Бэла была створана «Камісія па 2000 годзе», некалькі пазней – футуралагічная група «Белы дом глядзіць у будучыню». У 1965 г. у Францыі праведзена Першая міжнародная канферэнцыя футуролагаў. У 1966 г. заснавана Сусветнае футуралагічнае супольніцтва. Сусветная федэрацыя даследаванняў будучыні (The World Futures Studies Federation (WFSF)) была створана толькі ў 1974 г. І толькі ў 1989 г. яе калектыўным членам становіцца СССР.

Трэці этап – канец 1960 – сярэдзіна 1970-х гг. Гэты этап звязаны з экалагічнай, антытэхналагічнай, антысцыентысцкай і футуралагічнай хвалямі, першым дакладам Рымскаму клубу (1968 г.). Постіндустрыяльнае грамадства ўяўлялася як вынік трансфармацыі капіталізму і

сацыялізму падчас канвергенцый. Выйшлі ў свет даклад «Межы росту» пад кіраўніцтвам Д. Мядоўза (1972), працы Д. Габора і У. Каломба «За межамі стагоддзя марнатраўства» (1978)) [4–5].

Чацвёрты этап – з канца 1970-х гг. – футуролагі сталі звяртацца да пошуку шляхоў рашэння глабальных праблем чалавецтва. У сярэдзіне 1990-х гг. гэта праблематыка перацякла ў тэрміны глабалістыкі і глабалізацыі. У 1999 г. была створана Міжнародная акадэмія даследаванняў будучыні (International Futures Research Academy) – партнёр WFSF.

Такім чынам, пачаткам гісторыі навуковага прадбачання лічыцца той момант, калі будучыня ператварылася ў прадмет спецыяльнага навуковага даследавання. Гэта адбылося ў 1960-х гг., калі прагнастычныя даследаванні сталі адным з асноўных кірункаў у дзейнасці аналітычных цэнтраў. Павялічыўся ўплыў навуковых прагнозных распрацовак на прыняцце палітычных і сацыяльна-эканамічных рашэнняў.

Такім чынам, пачатак гісторыі палітычнага прагназавання адносяць да 1960-х гг. У станаўленні ўласна палітычнага прагназавання з канца 1960-х гг. да цяперашняга часу можна вылучыць некалькі этапаў.

Першы этап – канец 1960 – першая палова 1970-х гг. – найбольшая ўвага надавалася пытанням тэхнічнай і сацыяльнай палітыкі.

Другі этап – другая палова 1970 – пачатак 1980-х гг. – сістэматычна праводзіліся даследаванні экалагічнай палітыкі, розных аспектаў постіндустрыяльнага грамадства, ролі палітыкі ў ім.

Трэці этап – сярэдзіна – канец 1980-х гг. – найбольшая ўвага надаецца эканамічным і палітычным (будучыні палітыкі і кіраванню) пытанням.

Чацвёрты этап – з 1990-х гг. да цяперашняга часу – павелічэнне колькасці даследаванняў, прысвечаных глабальным праблемам, разгляд пытанняў, звязаных з працэсамі глабалізацыі і зменамі ў сусветнай палітыцы.

А. Тофлер прааналізаваў зрухі ў балансе ўлады на глабальным узроўні. Падчас пераходу ад даіндустрыяльнага да постіндустрыяльнага грамадства якасна змяняліся крыніцы ўлады: на змену сіле – багацце, на змену багаццю – веды. Распрацоўшчыкі канцэпцыі інфармацыйнага грамадства паказваюць на фарміраванне глабальнай інфармацыйнай прасторы, што забяспечвае эфектыўнае ўзаемадзеянне і доступ да інфармацыйных рэсурсаў. Інфармацыйныя тэхналогіі ў будучыні прывядуць да зараджэння сацыяльна-эканамічнай сістэмы, якая аб'яднае ўвесь свет. У адрозненне ад аптымістычных прагнозаў, С. Хантынгтан малюе карціну сутыкнення цывілізацый, глыбіннай асновай якога з'яўляюцца рэлігійныя супярэчнасці. Песімістычныя і прагнозы Ф. Фукуямы аб тым, што краіны «трэцяга свету» будуць заставацца на «завуголлі гісторыі». І. Валерстайн паказваў на магчымасць рэалізацыі ў будучыні такіх сцэнарыяў, як «неафеадалізм» здрабненнем суверэнітэту і ўзнікненнем мноства аўтаркічных рэгіёнаў. Дж. Найсбіт пісаў аб тым, што распаўсюджванне новых тэхналогій патрабуе адэкватнага адказу з боку чалавека, і выступаў супраць ператварэння грамадства ў «тэхналагічна заражаную зону».

Бюро разведкі і даследаванняў дзяржаўнага дэпартамента ЗША і ЦРУ з прыцягненнем супрацоўнікаў Гарвардскага ўніверсітэта, Бруклінскага інстытута і Фонду Карнегі актыўна распрацоўваюць праект «Сусветная будучыня», у якім даюцца наступныя глабальныя *мегапрагнозы*: дзяржавы з неэфектыўнай уладай не змогуць выкарыстаць перавагі глабалізацыі, што прывядзе да шэрагу канфліктаў, якія пагаршаюць адносіны паміж рэгіянальнымі лідарамі і аўтсайдарамі; прагназуюцца тэндэнцыі паслаблення глабальнага ўплыву ЗША пры росце моцы Кітая. Супрацоўнікі карпарацыі «РЭНД» вывучаюць будучыню па сродках ацэнкі дынамікі асноўных кірункаў навуковага прагрэсу, праводзяць даследаванні будучых сістэм узбраення.

Адрозніваюць асаблівасці акадэмічнага і прыкладнога палітычнага прагназавання. *Акадэмічнае палітычнае прагназаванне* – навуковае, аб'ектыўнае даследаванне, якое вывучае тэндэнцыі і заканамернасці развіцця палітычнай сістэмы або яе структурных элементаў. Яно ўжываецца для глабальных прагнозаў, выяўлення перспектыў глабальных палітычных працэсаў і будучыні палітычнай светабудовы. Атрыманы прагноз носіць імавернасны і рэкамендацыйны характар; выконвае інфармацыйную функцыю і не звязаны непасрэдна з працэсам прыняцця і рэалізацыі палітычных рашэнняў; разлічаны на доўгачасовы перыяд; задае агульны кірунак прагнозна-аналітычным даследаванням. Палітычныя прагнозы, распрацаваныя ў рамках тэарэтычнай паліталогіі, з'яўляюцца палітычнымі праектамі будучыні. Тэрмін «праект» стасуецца з *макрапрагнозам* глабальнага ўзроўню. Тэндэнцыі будучыні сусветнага развіцця звязаны з экалагічнымі «межамі росту», са зменай маральнай і паводзінскай парадыгм чалавецтва, адначасовай глабалізацыяй і фрагментацыяй (*глакалізацыяй*) сусветнай сістэмы, паглыбленнем палярызацыі паміж квітнеючымі і менш развітымі краінамі, парадоксамі дэмакратызацыі, пагрозамі сусветнай стабільнасці і бяспецы. Глабальныя прагнозы нацэлены на ацэнку кантролю над рэсурсамі ў глабальных маштабах і выяўленне пагроз стабільнаму развіццю чалавецтва.

*Прыкладное палітычнае прагназаванне* вывучае перспектывы пэўных палітычных з'яў і падзей, цесна звязана з працэдурай планавання, працэсам прыняцця палітыка-кіраўнічых рашэнняў, арыентуецца на вырашэнне надзённых палітычных задач і рэалізацыю аператыўных палітычных праектаў, даследуе абрысы кароткатэрміновых палітычных працэсаў. Прыкладныя прагнозы ў палітыцы носяць тэндэнцыйны характар, маюць пэўнага заказчыка і абслугоўваюць яго інтарэсы. Яны непасрэдна звязаны з магчымасцю аператыўнай рэакцыі ў выглядзе палітычнага рашэння. Такі прагноз становіцца фактарам дэтэрмінацыі дзеянняў асоб, якія прымаюць рашэнні. Прыкладная прагностыка ў палітыцы аператыўная, дакладная, мае ўтылітарны характар. Фактычна, задача прыкладнага прагнозу заключаецца не толькі ў аналізе палітычных працэсаў, але і ў кіраванні імі. У прыкладным прагназаванні выкарыстоўваюцца эксперыменты, якія маюць структурную і функцыянальную характарыстыкі. У структурным выглядзе эксперыменты адрозніваюцца свядомым умяшаннем у палітычны працэс, а ў функцыянальным звязаны з праверкай меркаванняў аб фактарах і выніках тых або іншых падзей. Эксперыменты падлягаюць бягучаму кантролю, дазваляюць улічыць дадатковыя і выпадковыя фактары ў палітычным працэсе.

Для паспяховага прагназавання неабходна спазнаць заканамернасці развіцця аб'ектаў палітычнай прагностыкі, раскрыць механізм іх дзеяння. Прафесар Б.І. Красноў адзначае, што «законы, дзейнічаюць у сацыяльна-палітычнай галіне, выяўляюцца як тэндэнцыі і магчымасці, якія далёка не заўсёды ператвараюцца ў рэчаіснасць» [6, с. 90–91]. Адным з ключавых законаў палітычнай рэчаіснасці з'яўляецца закон прычыннасці. Аднак, па нашых меркаваннях, пазнання законаў функцыянавання палітычнай сістэмы ў нармальных для яе ўмовах недастаткова для распрацоўкі сур'ёзных доўгатэрміновых прагнозаў, бо яны адлюстроўваюць толькі адзін бок руху палітычнай сістэмы – колькасныя змены пры захаванні яе асноўнай структуры і элементаў. Адзначым, што ў развіцці палітычнай сістэмы адбываюцца не толькі руцінныя працэсы і колькасныя змены, але і карэнныя якасныя зрухі, якія прыводзяць да пераўтварэння ўсяго яе будынка і характару. Таму неабходна ўлічыць і якасныя змены палітычнай сістэмы.

Літаратура

1. Методологические проблемы социального прогнозирования / под ред. А.П. Казакова. – Л.: Изд-во Ленингр. ун-та, 1975. – 128 с.
2. *Bloomfield, L.P.* Short-order futures: short-range forecasting in foreign affairs / L.P. Bloomfield // Forecasting in international relations: theory, methods, problems, prospects / ed.: N. Choucri, T.W. Robinson. – San Francisco, 1978. – P. 278–289.
3. *Бенедиктов, Н.А.* Методологические и идеологические аспекты критики буржуазной футурологии / Н.А. Бенедиктов // Актуальные проблемы современной идеологической борьбы: материалы II Всесоюз. школы молодых ученых и специалистов по проблемам идеол. борьбы (ММЦ «Ростов Великий», Яросл. обл., 4–11 мая 1981 г.): в 2 вып. / редкол.: В.Г. Смолянский (отв. ред.) [и др.]. – М., 1982. – Вып. 2. – С. 140–143.
4. Beyond the age of waste: a report to the Club of Rome / D. Gabor [et al.]. – Oxford; New York: Pergamon Press, 1978. – 237 p.
5. The Limits to Growth: A Report for the Club of Rome's Project on the Predicament of Mankind / D.H. Meadows [et al.]. – New York: Universe Books, 1972. – 205 p.
6. *Краснов, Б.И.* Политическое прогнозирование / Б.И. Краснов // Социально-политический журнал – 1994. – № 11–12. – С. 84–94.

Summary

*In article stages of political forecasting as scientific direction are investigated. Features of the academic and applied political forecasting, stages of its institutionalizing are considered.*

Паступіў у рэдакцыю 17.06.2011 г.